Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 34. Вільня, Субота 8 Кастрычніка 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

15-ыя ўгодкі „Крыніцы".

(*8.X.1917—8.X.1932*).

8 кастрычніка сёлетняга году мінае роўна 15 гадоў, як у Пецярбурзе паказаўся на сьвет першы нумар «Крыніцы». Пражыць беларускай часопісі 15 гадоў, гэта рэч сапраўды годная ўвагі. На добры лад юбілей гэты належала-б адпаведна адсьвяткаваць. Але дзеля таго, што цяжкі і галодны час наш ня спрыяе сьвяткаваньню, мы агранічваемся толькі да гэтага артыкулу, адзначаючы ў ім кароткую гісторыю нашай часопісі, робячы пару ўваг аб характары яе і падаючы толькі галаўнейшыя факты з яе жыцьця.

З Пецярбурга «Крыніца» ў лютым 1918 г. перанеслася ў Менск, дзе, на жаль, вышаў яе толькі адзін нумар; рэвалюцыйныя і акупацыйныя на Беларусі часы ня спрыялі правільнаму яе разьвіцьцю.

З Менску часопісь наша перавандравала ў Вільню, гдзе ў жніўні месяцы 1919 г. паказаўся першы яе нумар. Лёс «Крыніцы» тут ня быў лёгкі: даваліся ўзнакі труднасьці грашовыя, а так-жа і польская вайсковая цэнзура, якая дужа ўважна чытала нашу газэту і не шкадуючы чыркала яе чырвоным атрамантам.

Такі-ж самы незайздросны лёс пражывала «Крыніца» і ў наступным 1920 г. І ў гэтым годзе «Крыніцай» «апякавалася» так-жа вайсковая цэнзура.

Год 1921, час так званай «Сярэдняй Літвы» ў нашым краю, прынёс «Крыніцы» цалком неспадзяваны ўдар па ёй. Польскія ўлады «Сярэдняй Літвы» за артыкул аб Віленскім Сойме (№ 32, 30.X.21) далейшы выхад «Крыніцы» спынілі. «Крыніца» шкодзіла польскім выбарам у Віленскі Сойм і затым гэткая спаткала яе доля.

У 1922 г., у верасьні месяцы, пасьля далучэньня ўжо нашага краю да Польшчы, «Крыніца» змагла паказацца на сьвет узноў. Год гэты абышоўся для «Крыніцы» бяз ніякіх асаблівых здарэньняў.

Год 1923 прынёс «Крыніцы» першую канфіскату адміністрацыйнымі ўладамі.

У 1924 г. рэдактара «Крыніцы» спаткаў першы суд за тры неканфіскаваныя нумары. У гэтым-жа годзе былі так-жа чатыры канфіскаты.

Год 1925 прынёс «Крыніцы» пяць канфіскат і пракурорскі загад аб спыненьні яе. Такім чынам «Крыніца», на дзевятым годзе свайго існаваньня, памерла не сваей сьмерцяй. Замест яе, 20.IX.25 г. пачала выходзіць «Беларуская Крыніца», з якім назовам яна існуе і сяньня. Ясна, што зьмена гэта была чыста фармальнай і што фактычна існавала далей і існуе сяньня тая-ж «Крыніца».

Рэдактар «Крыніцы» Б. Туронак ад 1923 г. да другой паловы 1925 г. меў за «Крыніцу» дзесятак судовых спраў, за якія быў асуджаны на тры месяцы вастрогу з стрыманьнем кары на пяць гадоў. Рэдактар аднак турмы скаштаваў, бо нешта месяц сядзеў да суду. Мела так-жа рэдакцыя за гэты час ня мала грашовых штрафаў.

Год 1926 для «Бел. Крыніцы» гэта час ідэолёгічнага шуканьня, час абновы таго кірунку, якому яна служыла. У выніку гэтага шуканьня на бачынах «Бел. Крыніцы» паявілася новая праграма БХД, адноўленая, перадуманая і памагчымасьці датарнаваная да вымогаў часу і да патрэб беларускага народу. Першая праграма БХД, менская, з 1920 г., шмат у чым ужо вымагала папраўак, якія ў 1926 г. на бачынах «Бел. Крыніцы» і былі даканаваны. Год гэты прайшоў без канфіскат.

Год 1927 для «Бел. Крыніцы» прайшоў так-жа без канфіскат. «Бел. Крыніца» з гэтага году, пасьля абновы БХД, адзначаецца большай ідэолёгічнай яснасьцяй у галіне грамадзка-палітычнай, эканамічнай і культурна-рэлігійнай.

Год 1928 прынёс «Бел. Кр.» неспадзеўкі аж сем канфіскат і ў сьнежні месяцы ведамую забарону арцыб. Ялбжыкоўскага каталіком чытаць яе. Забарона гэта аднак «Бел. Кр.» не пашкодзіла, бо кожнаму было ясна, што загад гэны паходзіў з матываў палітычных і што з чыстым сумленьнем каталік можа да яго не стасавацца. Так яно і сталася.

Ад 1929 г. да нашых часоў, »Беларуская Крыніца», перажыўшы за чатыры гады пятнаццаць канфіскат, (а рэдактар яе Я. Пазьняк перанес на сваім карку больш дзесятка судовых спраў), разьвіваецца даволі памысна далей.

Усіх канфіскат да сягоньняшняга дня «Крыніца» мела 32. Усе яны дакананы польскімі ўладамі.

У пэрыодзе Пецярбурскім, Менскім і ў першых гадох пэрыяду Віленскага «Крыніца» мела характар пераважна каталіцкі. Ад 1926 г., ад ідэолёгічнай абновы БХД, «Бел. Крыніца» прыняла характар агульна народны і агульна хрысьціянскі, служачы інтарэсам грамадзкім эканамічным і культурна-рэлігійным беларусаў як каталікоў, так і праваслаўных. Дзеля гэтага «Бел. Крыніца» апошнімі гадамі пачала друкавацца і лацінкай і гражданкай, абслужваючы аднолькава і каталікоў і праваслаўных.

І так, сяньня мінула 15 гадоў існаваньня «Крыніцы» і яе адраджэнскай працы на беларускай ніве.

У першым нумары „Крыніцы" 1917 г., у заценцы ад Рэдакцыі, між іншым пісалася— „Пачынаем ад малога, каб расьці, пачынаем невялічкай сьлюзой, выплываючай з крыніцы, каб заўсёды плыць".

Гэтыя намеры і пажаданьні першых выдаўцоў і рэдактароў „Крыніцы", як бачым, споўніліся — сяньня „Крыніца" сьвяткуе свае 15-ыя ўгодкі.

Дай-жа Божа, каб „Беларуская Крыніца" плыла і далей, як дагэтуль—была ажыўчаю расіцай для беларускага народу — дзеля яго разьвіцьця духовага і дабрабыту матэрыяльнага на народных, самастойных падставах.

Падгатоўка да Царкоўнага Сабору і Беларусы.

Ужо некалькі гадоў вядзецца падгатоўка да Царкоўнага Сабору ў Польшчы, які мае, як цьвердзяць царкоўныя дзеячы, упарадкаваць рэлігійнае жыцьцё праваслаўнага насельніцтва пад Польшчай.

Цьвярджаньні, што Сабор мае ўпарадкаваць рэлігійнае жыцьцё праваслаўнага насельніцтва пад Польшчай, пацьвярджаюць, што гэнае жыцьцё не ўпарадку. І сапраўды. Прыкладам рэлігійнае жыцьцё праваслаўных беларусаў у Зах. Беларусі, дык зусім не ўпарадку.

На тэрыторыі Зах. Беларусі, якая падзелена на тры праваслаўныя епархіі, навучаньне рэлігіі ў школах, прапаведзі ў цэрквах і ўсё царкоўнае жыцьцё адбываецца толькі парасейску. Словам, як бы тут расейскі народ і расейская краіна. А тымчасам тут насельніцтва ў абсалютнай большасьці беларускае і край гэта не расейскі, а беларускі.

Якія-ж плады гэтага місіянарства расейшчыны праз Царкву на Беларусі? Вельмі сумныя. Побач з афіцыяльным хрысьціянствам, упалненым у нас у праваслаўнай Царкве расейшчынай, шырыцца, асабліва апошнімі гадамі, бязспынна бязверра, сэктанства, вырастае маральнасьць і пашыраецца распуста.

Якія-ж меры супроць гэтага прымае расейскае ў нас духавенства і што супроць гэтага робіць? А тое самае робіць, што рабіла і за часоў расейскага царызму. „Пабожна" моліцца ў амаль пустых цэрквах і стараецца дэманстраваць сваю лёяльнасьць да польскай дзяржаўнай улады, як калісь дэманстравала верападданасьць расейскаму цару. У гэтым блізу і заключаецца ўся душпастырская праца духаўніка расейца сярод беларусаў. Ня лепш дбаюць аб сваю беларускую паству і кіраўнікі праваслаўнага рэлігійнага жыцьця на нашых землях—епіскапы расейцы і расейскае кіраўніцтва аўтакефальнай Царквы ў Польшчы.

Незважаючы на чысьленныя рознага роду просьбы праваслаўнага беларускага грамадзянства ў справе гэтага рэлігійнага бязладзьдзя, на просьбы і дамаганьні беларусаў слова Божага да народу ў роднай мове, пабеларуску, як спосабу дзеля лепшага пазнаньня і зразуменьня народам навукі Хрыстовай, духоўныя ўлады маўчаць і ўпоруста трымаюцца ў царкоўным жыцьці на беларускіх землях расейшчыны.

Усе гэтыя недамаганьні хворага духова праваслаўнага арганізму, паводле слоў царкоўных дзеячоў і расейскіх царкоўных публіцыстаў, мае пудоўна вылячыць Царкоўны Сабор, скліканьне якога цалком залежнае ад гэтых-жа кіраўнікоў Царквы і міністра веравызнаньняў. Але дапусьцім, што Сабор будзе скліканы і гэтага трэба спадзявацца, бо падгатоўка да Сабору вядзецца і прадсаборныя камісіі працуюць.

Праца прадсаборных камісіяў палягае на тым, каб падгатаваць матэрыял да разгляду на Сабор. А матэрыял гэты, абняты прадсаборнымі камісіямі, выглядае вось так: 1) паглыбленьне ў народзе зразуменьня навукі Царквы, 2) падняцьце маральнасьці ў народзе, 3) падняцьце аўторытэту духавенства і 4) змаганьне з рэлігійнай аблудай.

Як спосабы рэалізацыі гэтых постулятаў, прадсаборныя камісіі прапануюць: узнаўленьне лучнасьці між веруючымі, урачыстыя набажэнствы, азнаямленьне веруючых з догмамі веры, крытыка матэрыялістычных тэорыяў, выдавецтва брашурак і адозваў супроць атэізму і сэктанства, выдавецтва царкоўнай штодзеннай газэты для народу і зьмена спосабу матэрыяльнага забясьпечаньня духавенства, які-б унезалежніў духавенства ад народу ў сэнсе матэрыяльным.

Як мае праводзіцца гэтае ўзнаўленьне лучнасьці між веруючымі, як мае быць тлумачана веруючым навука Царквы, ці ў роднай мове народу ці ў якой іншай, як маюць быць выдаваны агітацыйныя брашуры, адозвы, а асабліва штодзенная газэта, парасейску, паўкраінску, ці пабеларуску, або можа папольску — нічога не гаворыцца, над гэтай справай прадсаборныя камісіі моўчкі пераходзяць да далейшага парадку дня. Словам, у гэтай справе прадсаборныя камісіі ўважаюць, што „усё ўпарадку" і павінна астацца ўсё пастарому, бо ў праваслаўі павінен быць „русскій дух", а ў Царкве мусіць „пахнуть Русью."

Дык дзе ж загука і дзе пэўнасьць, што Сабор вылечыць недамаганьні хворага духо-

Камо грядеши?

(Аб Т-ве Беларускае Школы).

У „Інфармацыйным Бюлетэні Т. Б. Ш.“ (Вільня 28 верасьня 1932 г.) мы знаходзім цікавую інфармацыю аб дзейнасьці Т-ва Беларускае Школы ў Беластоцкім вокрузе, асабліва аб тым, што гурткі Т. Б. Ш. самастойна адбываюць конфэрэнцыі з прадстаўнікамі польскай дзяржаўнай адміністрацыі ў плошчы аб‘яднаньня і супрацоўніцтва з польскімі „грамадзкімі“ арганізацыямі, прыкладам, з польскай арганізацыяй „Młodzieży Wiejskiej.“ Яшчэ больш цікавыя гэтыя інфармацыі тым, што й цэнтральныя ўлады Т. Б. Ш. прызналі гэтыя конфэрэнцыі ўправаў гурткоў Т.Б.Ш. з прадстаўнікамі дзяржаўнай адміністрацыі за правільныя і наказалі, што „гурткі Т.Б.Ш. ня могуць ухіляцца ад конфэрэнцыяў, скліканых прадстаўнікамі (дзяржаўна-адміністрацыйнай—рэд.) улады.“

Каб ня былі гэтыя радкі праўды галаслоўнымі, перадрукоўвуем факты з „Бюлетэню Т. Б. Ш.“

Пісьмо з Беластоцкага ваяводзтва да Галоўнай Управы Т. Б. Ш. (30.VII.1932).

„У часе апошніх некалькіх месяцаў прадстаўнікі ўлады агульнай адміністрацыі адбылі рад канфэрэнцыяў беспасярэдна з управамі паасобных гурткоў Таварыства Беларускай Школы ў беластоцкім і ваўкавыскім паветах. На гэтых канфэрэнцыях былі абгавараны справы ізаляцыі гурткоў Таварыства ад уплываў разбураючых і неадказных элемэнтаў і супрацоўніцтва гэтых гурткоў з вядучымі пазытыўную для Дзяржавы дзяяльнасьць польскімі грамадзкімі арганізацыямі, якія урэшце статутовымі мэтамі ёсьць зродныя Таварыству Беларускай Школы.

„Вынікі гэтых канфэрэнцый настольскі задаволівалі ўладу агульнай адміністрацыі, што ўправы названых гурткоў ня толькі выразілі поўную гатоўнасьць паборваньня на грунце Т. Б. Ш. уплываў неадказных чыньнікаў і супрацоўніцтва з польскімі грамадзкімі арганізацыямі, але нават падкрэсьлілі жывую па іх думцы карысьнасьць гэтага для Таварыства.

„Зусім іншае ў гэтым пытаньні становішча заняла Акружная Управа ТБШ ў Беластоку, якая, як сьведчыць яе пісьмо да Управаў Гурткоў Вокругу з дня 13.IV. (хіба 13.VI?—рэд.) г. г. № 89, на паседжаньні дня 12 чэрвеня г. г. прыняла пастанову, забараняючую Гурткам Таварыства супрацоўніцтва з польскімі грамадзкімі арганізацыямі і забараняючую тым-жа гурткам браць удзел без яе згоды у канфэрэнцыях, скліканых уладамі агульнай адміністрацыі...“

„Прыняўшы пад увагу, што Акружная управа ТБШ у Беластоку дапусьцілася ў гэтым выпадку паважных статутовых адхіленьняў і выступіла процconfigure праўна угрупаваных пачынаньняў уладаў агульнай адміністрацыі, Ваяводзкі Урад, на падставе 34 арт. Тымчасовых Правілаў аб арганізацыях і саюзах, просіць Галоўную Управу ўхіліць пастанову Акружной Управы ТБШ у Беластоку з дня 12 чэрвеня г. г. у цэлым і завесіць гэтую управу ў працы.“

„У сувязі з старчўшымся палажэньнем было склікана 16. VIII паседжаньне Галоўнай Управы ТБШ, якая прыняла цэлы рад пастаноў разьясьняючых свае погляды на гэту справу і выслала 23.VIII делегацыю ў Беластоцкае ваяводзтва ў складзе: старшыні Галоўнай Управы Т.Б.Ш. Ф. Стэцкевіча, сябры Галоўнай Управы М. Марцінчыка і старшыні Беластоцкай Акружной Управы Я. Грэся.

„Дэлегацыя, як падае „Бюлетэнь“—разьвіла падрабязьней сваё становішча ў справе супрацоўніцтва Т-ва з польскімі грамадзкімі арганізацыямі і адносіны Галоўнай Управы да Беластоцкай Акружнай Управы у сувязі з пастановай яе, як у памянёнай справе, так і ў справе конфэрэнцыяў з гурткамі ТБШ, скліканых уладамі.“

„Прадстаўнік ваяводзкай ўлады, заступнік Начальніка Аддзелу Публічнай Бясьпечнасьці п. Высокінскі зазначыў, што супрацоўніцтва зьяўляецца прапазыкай, а не ёсьць загадам улады. Улада вымагае толькі каб арганізацыі Т-ва не вялі агітацыі проці польскіх арганізацыяў, з чым дэлегацыя згадзілася.“

Пры гэтым, як падае той-жа „Бюлетэнь“ — „Дэлегацыя запрапанавала склікаць Акружны зьезд дзеля выбараў новай Управы ўвосені, пасьля заканчэньня палявых работ.“

„У той-жа дзень, піша „Бюлетэнь“, адбылося паседжаньне Беластоцкай Акружной Управы з удзелам прадстаўнікоў Галоўнай Управы Стэцкевіча і Марцінчыка, на якой прынята наступная пастанова:

„Акружная Управа ў Беластоку на сваім паседжаньні з дня 23.VIII 1932 г., азнаёміўшыся з пісьмом Беластоцкага Ваяводзтва у Галоўную Управу ТБШ з дня 30.VII.1932 г. № 2858/32, пратаколам паседжаньня Галоўнае Управы з дня 16 жніўня г. г. і адказам Беластоцкаму Ваяводзтву Галоўнай Управай ТБШ з дня 20.VIII 32 г. а таксама выслухаўшы справаздачу сябраў Галоўнае Управы Ф. Стэцкевіча і М. Марцінчыка і старшыні Акр. Управы у Беластоку Я. Грэся з інтэрвэнцыі ў Беластоцкім Ваяводзтве дня 23.VIII.32 г. у сувязі з пастановай Беластоцкае Акружнае Управы з дня 12.VI г. г. у справе супрацоўніцтва гурткоў ТБШ з польскімі грамадзкімі арганізацыямі і браньня ўдзелу ў конфэрэнцыях сябрамі гурткоў з прадстаўнікамі ўраду — пастаноўлена прызнаць, што гурткі ТБШ ня могуць ухіляцца ад конфэрэнцыяў, скліканых прадстаўнікамі ўлады.“

Пасьля гэтых гутарак дэлегацыі ТБШ. з прадстаўнікамі Беластоцкай ваяводзкай адміністрацыі і конфэрэнцыяў управаў гурткоў ТБШ. з прадстаўнікамі дзяржаўнай адміністрацыйнай ўлады, як даведваемся, вядзецца цяпер у Беластоцкім вокрузе падгатоўка да акружнога зьезду ТБШ., які мае хутка адбыцца, пэўне ж не без паразуменьня з ваяводзкімі ўладамі.

Якія рэзультаты будуць гэтых **гутарак і конфэрэнцыяў** —пакажа гэты зьезд.

п—к.

Мала прачытаць газэту самому:
трэба
яе прачытаць сабраным суседзям разам!

ва беларускага арганізму і ўнармуе наша рэлігійнае жыцьцё? Хіба толькі вера ў цуд. Але цуды не здараюцца на затрэбаваньне. Дык мы хочам разглядаць гэту справу так, як яна прадстаўляецца. А прадстаўляецца яна так, што калі йшчэ прад Саборам не наступіць зьмена ўнутры царкоўнай палітыкі, дык беларусам ад Царкоўнага Сабору спадзявацца няма чаго, бо Сабор, які падгатаўляецца расейскім духавенствам, прывыкшым праваслаўныя народы ўважаць „русскими“, а праваслаўе—верай „русского народа,“ патрэб нашага народу не заўважыць і пройдзе над імі да парадку дзеннага: — калі не закрэпіць ў нас у жыцьці расейшчыны, дык завядзе польшчыну.

Крывіч.

В. Багдановіч:

„К сонцу душой!“

Крытычны нарыс творчасьці Я. Купалы з пункту гледжаньня характва і мастацтва.

(У 50-тыя ўгодкі нарадзінаў паэта 25.VI. 1882—25.VI. 1932). (3)

IV.

Вонкавая форма творства Я. Купалы, як найбольш выразная асаблівасьць ягонай паэзіі.

Ад ідэйнай стараны творчасьці Купалы пяройдзем да яе формы.

Максім Гарэцкі ў сваёй „Гісторыі Белар. Літэратуры“ гавора аб Янцы Купале, што „лірыка яго больш музыкальная, чымся пластычная“. За ім гэта паўтараюць і шмат іншых беларускіх крытыкаў Купалы. Але гэты прыгавор мне здаецца нейкім дзіўным непаразуменьнем. Наадварот — Я. Купала менш за ўсе музыка у сваёй паэзіі, а перад усім ён ёсьць маляр, а яшчэ вярней—скульптар. Вобразы яго, як і параўнаньні не адзначаюцца навізной, трава ў яго „як дыван“, каласы „шэпчуцца“, думы „як хмары,“ раса „як брыльянты“, „ноч спавівае туманам зямлю“ і г. д. Але гэтыя абразы заўсёды яркія, выпуклыя, пачынаючы ад ягонага якога-небудзь камічнага Юркі, ці Свата, ці двух сваякоў за чаркамі і канчаючы надзвычай шляхотнымі, поўнымі павагі і сьвядомасьці сваёй годнасьці гусьляра у „Кургане.“ І ня толькі ў сваім эпосе, ці у драме, але і ў лірыцы, якая зьяўляецца сапраўднай стыхіей Купалы, ён заўсёды рысуе, ці як бы вырэзывае нам вобраз за вобразам, стараючыся імі перадаць нам тыя настроі, якія ахопліваюць яго душу. Дужа часта пры гэтым Купала карыстае з „гукавага спосабу“ перадачы уражаньня, што здаецца і зьяўляецца прычынай легенды аб музыкальнасьці яго вершаў. Вось напрыклад як рысуецца ў яго гадзіньнік:

Так—не—так—не
Загарак гамоне,
Так—не—так—не
Учора й сягоньня.
Так—не—так—не
і г. д.

А вось як касец б‘е касу:

Стут—стук малаток,
Кляпі касу, мужычок
Кляпі вастранька сваю
А я песеньку сьпяю:
Гоп, гоп, гоп...

На падобны манер у яго малююцца і шавец і пастыр з трубой („тру—тру“). А вось як і сам Купала скрыпіць пёркам:

„Змачу пёрка ў атрамэнту
Ды як чыркну па паперы:
Крэнту-мэнту, крэнту-мэнту
і г. д.

Музыкальнасьцю мы называем асобнае, выдатнае дабрагучча вершаў, дзе і словы і гукі слоў, самі сабой, часта паміма волі паэта, складаюцца так трафна, што самае ўжо спляценьне гэтых гукаў лашчыць нашае вуха і сваім дабрагуччам і рытмам дае нам асобнае эстэтычнае задаваленьне. Але-ж усе гэтыя прыклады спробаў Купалы гукамі перадаць пэўны абраз ёсьць простае гуканасьлядаваньне (звукоподражаніе) Мы ведаем і напэўна многа хто з нас бачыў людзей, якія дужа ўмела перадаюць розныя гукі жывёл, ці машын, напрыклад: як брэша сабака, як вядзе курну кот, як гудзіць пчолка, ці камар, як шыпіць грамафон, але такія людзі ня ёсьць музыкі, хоць іхныя вобразы і дужа выразныя і выпуклыя.

Так і ў Я. Купалы, — наогул яго вобразы заўсёды ясныя, выразныя, рэльефныя. Па сваёй пластычнасьці яны часта мімаволі напамінаюць той прымітыўны, наіўны рэалізм, які мы часта спатыкаем у клясычных паэмах („Іліадзе,“ „Одысэі“) гдзе падрабязна апісываецца кожная рэч, кожны рух сцэнкі (які быў шлем, ці шчыт у Гэктара, ці ложка ў Одысэя; як лілася кроў з горла забітага, як ён корчыўся, як „дрыгалі нагамі“ слугі Одысэя, якіх ён вешаў за распусту і г.д.). У Я. Купалы часта гэта рэльефнасьць здаецца ўжо і лішняю, бо іншы раз даходзе да нейкай грубаватасьці і нават зьбіваецца на прозу:

Трэба нам трэба перш-на-перш хлеба,
Хлеба каб стала на цэленькі год,
Дроўцаў палена, конікам сена,
Капейку якую сабе на зварот.

Ці вось яшчэ ярчэйшы прыклад:

Пан за тваю працу
Нібы то й заплаце.
Знай плату за плату
Зьбярэш з ей багацьце
За гадзін семнаццаць
Трудоў ў дзень нязьменьне
Выйдзе грошаў дваццаць
Або й таго меней.

З беларускага жыцьця.

Суд над рэд. „Бел. Крыніцы“. Дня 15.IX с. г. адбыўся суд над рэд. „Б. Крыніцы“ па канфіскаце № 20 з дня 22.V.1932 г., за стацьці: „Што нас дзеліць?“, „Таварыства Беларускай Школы“ і „Шануйма нашу родную мову“. У гэтай справе суд рэд. Пазьняка апраўдаў. Чарговы суд, па канфіскаце № 42 з дня 25.XII.1931 г., за стацьці: „Нарады Зьезду прадстаўнікоў Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі“, „Перамога“ (з студэнскага жыцьця) і „Аб нашым жыцьці“, адбудзецца 15 г. м.—Наступны суд гатуецца ў Вялейскім павеце, дзе гарадзкі суд дапрашвае 11 г. м сьведкаў на абвінавачаньне рэдактара нашай газэты.

„Царква і Народ“. Даведваемся, што ў хуткім часе мае выйсьці наступны (другі) нумар беларускай праваслаўнай часопісі „Царква і Народ“.

„Бюлетэнь Т-ва Беларускай Школы“. Гэтымі днямі выйшаў з друку другі чарговы (як адзначнёўка) інфармацыйны Бюлетэнь Т-ва Б. Ш. Зьмест багаты, а яшчэ больш цікавы.

Вызначэньне суду над б. паслом Б. Тарашкевічам. Як даведваемся, суд над б. паслом Бр. Тарашкевічам у Віленскім Акружным судзе вызначаны на 28 лістапада с. г. У гэтым працэсе будуць судзіць разам з Тарашкевічам 5—6 юнакоў, б. вучняў Віленскай Беларускай Гімназіі.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Ліквідацыя беларускай гімназіі ў Дзьвінску. З пачаткам сёлетняга 1932-33 школьнага году, латыскі міністр асьветы Кеніньш пачаў ліквідаваць беларускую гімназію ў Дзьвінску. Сёлета зачыніў I клясу і гэтак год па году мае зьліквідаваць яе цалком.

Характэрна, што латыскі ўрад робіць з беларускай гімназіяй у Дзьвінску тое самае, што польскія ўлады зрабілі з беларускімі гімназіямі ў Вільні і Наваградку — адкрывае пры латыскай гімназіі беларускія паралельныя клясы.

Супроць гэтага гвалту міністра Кеніньша над беларускай меншасьцяй у Латвіі выступілі з пратэстам, праўнай дарогай, бацькі пакрыўджаных міністрам Кеніньшам дзяцей, якія ў ліку 32 былі прыняты ў I клясу гімназіі, а цяпер асталіся на вуліцы бяз школы і Т-ва Беларускіх Вучыцялёў у Латвіі. Да гэтай справы яшчэ вернемся ў наступным нумары.

З украінскага жыцьця.

Жалаба ў Лігу Народаў. Газэты падаюць, што ў Жэнэву на цяперашнюю сэсію Лігі Народаў выехала ўкраінская дэлегацыя на чале з пасл. Міленай Рудніцкай, якая падасьць жалабу на адносіны пануючыя між украінскім насельніцтвам і польскай адміністрацыйнай уладай на Валыні.

З Польшчы.

Дзяржаўныя даходы зьмяншаюцца. Статыстыка дзяржаўнага камітэту падае, што ў жніўні с. г. дзяржаўныя даходы выносілі — 121 418 000 зл. У жніўні мін. году — 143,298,000 зл.

Беспасрэдныя падаткі ў жніўні с. г. далі—32 855,000 зл., у мін. годзе—42,464,000 зл. Павялічыліся даходы з падаткаў пасрэдніх—гэрб выя 1 акцызныя аплаты.

1,400 гаспадарак на ліцытацыі. Варшаўскае „Товажыство Крэдытове Земске“ выставіла на ліцытацыю за даўгі аж 1400 земляробскіх гаспадарак. Цікавае зьявішча, што між выстаўленымі на ліцытацыю гаспадаркамі даўгі вельмі малыя, бо толькі па некалькісот зл. Гэта паказвае, як вялікі крызыс у польскім земляробстве.

З заграніцы.

Ліга Народаў у Эўропе і ў Азіі. Эўрапэйская Ліга народаў, ці лепш назваць Ліга дзяржаў, у Жэневе пачала гэтымі днямі свае нарады. На гэтай сэсіі Лігі прызнаны правы ўчасьця ў Радзе Лігі Народаў і Польшчы.

У далейшых нарадах гэтай сэсіі Лігі трэба спадзявацца, што яна будзе ратаваць свой аўторытэт, у справе падзеяў на Далёкім Усходзе — справа Манджурыі, — дзе гвалт Японіі паважна пагражае і эўрапэйскаму супакою. Але вось бяда, што Японія з аўторытэтам эўрапэйскай Лігі Народаў ня зусім лічыцца і падае свае вымогі ў гэту Лігу толькі на зацьверджаньне, а каб прымусіць эўрапэйскую Лігу прызнаць свае гвалты міжнародна праўнымі, пагражае выступленьнем з гэтай Лігі ды не паддавацца ніякаму яе аўторытэту. Мала гэтага, Японія, на выпадак пройгрышу ў Жэнэве, задумала і пачала арганізаваць такую ж Лігу Народаў у Азіі, з азіяцкіх дзяржаў, у якую стараецца ўцягнуць і савецкую Расею. Словам, жэнэўская старушка Ліга Народаў перажывае цяпер цяжкія часы свайго аэзмічнага (малакроўнага) жыцьця. А „прарокі“ вяшчуюць ёй блізкі канец.

Адзін выдатны ангельскі публіцыст, Стід, які цяпер прабывае ў Жэнэве і прыглядаецца да старчаскіх рухаў Лігі, піша ў ў газэты так: Ліга Нарадаў апынулася ў цяжкім палажэньні. Калі канфлікт на Далёкім Усходзе Ліга разрашыць разумна, то яна сама і яе разаружныя конфэрэнцыі будуць існаваць далей. Калі-ж гэтага канфлікту не разрашыць, дык дні існаваньня Лігі Народаў і яе разаружных конфэрэнцыяў палічаны да канца сёлетняга году. Словам, найбольш важныя падзеі, пагражаючыя і эўрапэйскаму „правапарадку“, адбываюцца цяпер на Далёкім Усходзе.

Манджурыя толькі што нарадзілася, а ўжо грозіць. Нарадзіўшаяся пры помачы Японіі „незалежная“ Манджурыя разаслала ўжо розным дзяржавам ноты, у якіх трэбуе, каб прызналі яе, Манджурыю, незалежнай дзяржавай і то не пазьней, як у працягу паўгоду часу. У праціўным выпадку манджурскі ўрад грозіць тым дзяржавам, што яны згубяць тыя правы ў Манджурыі, якія яны маюць там на падставе дагавораў з Кітаем.

Польскія газэты падаюць, што манджурскі ўрад стараецца прызнаньня Манджурыі так-жа і Польшчай. У гэтай справе манджурскія ўлады навязалі зносіны з польскім консулам у Харбіне.

Гэты крок манджурскага ўраду выклікаў вялікае зацікаўленьне амэрыканскага ўраду, які з свайго боку намераны так-жа зьвярнуцца да сільнейшых дзяржаў, асабліва эўрапэйскіх, і пачаць з імі перагаворы ў справе супольнага пратэсту проціў пагрозы японскага гадунца — маладой Манджурыі.

Японскія ваенныя караблі на кітайскіх водах — у Кантоне. Прац кітайскім

„Беларуская Школа ў Латвіі“ — папулярна навуковы, пэдагогічны і літэратурна-грамадзкі штомесячнік. Рыга, верасень 1932 г. № 4 (14) — выйшаў з друку вельмі багаты і цікавы зьместам.

„Беларускае Навукова-Краязнаўчае Т-ва“. Як падае „Б. Ш. ў Латвіі“ гэнае краязнаўчае т-ва адкрывае свае аддзелы ў Дзьвінску і Люцыне.

„Дзесяць гадоў беларускай школы ў Латвіі“. Пад такім загалоўкам друкуецца і мае выйсьці зборнік працаў аб дзесяцігадовай працы беларускага грамадзянства над разьвіцьцём беларускага школьніцтва ў Латвіі.

Гэтыя прыклады больш падобныя да нейкіх грашовых разрахункаў, чымся да паэтычных твораў,—так іншы раз нават і шкодзіць пекнасьці твораў Купалы яго лішняе імкненьне найболей сьцісла і выразна прадставіць сваю думку.

Прыкладаў такой нейкай прозаічнасьці, ці нават грубаватасьці, пры адначаснай выразнасьці можна падаць дужа многа. Месяц у яго сьвеціць, „як лысіна у пава,“ ці „як дзюрка у сярмязе,“ літары на паперы стаяць „як быкі“ і г. д. А вось як гавораць паміж сабой лапаць з ботам:

Раз прытычкі лапцю бот
Сапаць стаў як з жмені:
Я — павага! — кажа ён,
А ты што? — Дрэнь—дрэняй.
Яму-ж лапаць: эй пакінь
Так хлусьціці ласа.
Я хоць дрэнь ды толькі з лык,
А ты—злуплен з мяса!

Трэба заўважыць, што гэтыя прыклады ўсе ўзяты з першых зборнікаў Купалы, з „Жалейкі“ і „Гусьляра.“ З часам, асабліва калі Я. Купала бліжэй пазнаёміўся з лепшымі расейскімі паэтамі, ды якраз яшчэ ў часы найвялікшага захапленьня іх праблемай вонкавай формы, верш яго надзвычай палепшыўся. Ён набывае і багацьця формы, а нават і тое, што мы завём музыкальнасьцю.

Такія вершы, як „Нашай ніве,“ „Курган,“ „Песьня сонцу,“ „Сонца,“ „Жняя“ і другія, нават большасьць яго вершаў з зборніку „Шляхам жыцьця“, асабліва з тых аддзелаў, якія азаглаўлены „Па межах родных“, „Для яе“ зьяўлюцца шэдэўрамі паэтыцкага мастацтва нават з усіх бакоў, ня выключаючы і музыкальнасьці.

Калі мы вышэй адзначылі, што вершы Я. Купалы менш музыкальныя, чым плястычныя, гэтым мы яму не адмаўлялі зусім музыкальнасьці. Зразумела, што ў такога мастака слова, як Купала, павінна знайсьціся нямала твораў, якія можна адзначыць і гэтай якасьцю. Але тое, што ён часта дапускае; нарушэньне гэтага вымаганьня, паказвае, што музыкальнасьць ня ёсьць стыхія яго творчасьці, але толькі выпадковае яе зьявішча, якога ён дасягае ў асобных прыкладах толькі тады, калі творчасьць яго падымаецца на найвышэйшыя ступені; так што з гэтага боку ён многа ўступае творчасьці такіх сваіх сяброў, як Я. Колас і М. Багдановіч. З боку-ж выразнасьці і рэльефнасьці вобразаў, яркасьці эпітэтаў, сярод беларускіх паэтаў роўнага яму няма.

Вышэй былі тут названы назовы некалькіх вершаў Купалы з тых, якія я ўважаю за найлепшыя. Большасьць іх добра ўсім ведама і было-б дарэмна тут цытаваць іх, але не магу ўстрымацца прывясьці цалком хоць адзін, каб на самым прыкладзе адзначыць тыя асаблівасьці яго творчасьці, аб якіх мы гаварылі вышэй. Прачытаем яго верш „Жняя:“

Як сама царыца
Ў залатой кароне
Идзе яна ў вяночку
Паміж сьпелых гоняў
З каласкоў вяночак —
Моладасьці сьведка —
Па ёй зіхапіцца,
Як у садзе кветка.
На грудзёх шчасьлівых
Каптанок ружовы,
У руцэ сярпочак
Зублены, сталёвы.
Вецер абнімае
Стан яе дзявочы,
Сонца ёй цалуе
Шыю, твар і вочы.
Каласкі хінуцца
Перад ёй паклонна,
Дзівіцца ігруша
На мяжы зялёнай.
А яна—царыца,
Весела, шчасьліва
Карануе песьняй
Залатое жніва.
Сьмела йдзе у сонцы,
Уся сама як сонца,
Гэта жнейка наша
У нашай старонцы!

Вобраз намаляваны нашым мастаком такі яркі, такі сонечны, такі выразны і выпуклы, і разам такі просты і ясны, што паэт нават сам як-бы зьдзівіўся яго яснасьці, як бы зьнячэўку для самога сябе пазнаў у сваім вобразе **сваё** роднае:

Гэта-ж **жнейка наша**
У нашай старонцы!

Вершы і словы ў гэтым творы коцяцца так гладка, так плаўна, так мякка, што тут Янка Купала і запраўды дасягае высокай музыкальнасьці. І побач з такімі вершамі нярэдка ў яго спаткаць можна і гэтакія:

„Пан справіць гучныя дажынкі
За пот-кроў сьлёзы водкі дасьць,“
якія нават ня лёгка і выгаварыць. Ці:
„У тваіх руках слава і доля,“
гдзе нават варта толькі пераставіць два словы (у руках тваіх слава і доля), як ужо верш робіцца больш дабрагучны. Вуха Янкі Купа-

паргоным горадам Кантонам паявіліся ўзноў японскія ваенныя караблі, якія прыбылі быццам ахараняць японскіх грамадзян у Кантоне. Прычына гэтай „ахаровы“ такая: Кітайцы байкатуюць японскія тавары і нічога ў Японцаў ня купляюць, дык Японія хоча застрашыць Кітайцаў, каб перасталі байкатаваць японскія вырабы і куплялі іх як дагэтуль.

Бальшавікі варочаюцца назад. Дня 20 мін. м-ца цэнтральныя ўлады С.С.Р.Р. выдалі дэкрэт, якім рэфармуецца дасюлешняя навука ў вышэйшых школах. Гэты дэкрэт нічога новага не заводзіць, а толькі касуе камуністычны „здабытак“ у гэтай галіне, бо заводзіць у вышэйшым школьніцтве прадрэвалюцыйны лад і парадак. Словам, як ня можна йсьці ўперад — трэба варочацца назад.

Да нас пішуць.

ТРЭБА ПРОПАВЕДЗЯЎ ПАБЕЛАРУСКУ.

Слонім, як я ужо пісаў у „Б. Крыніцу.“ гэта гандлёвы цэнтр ваколічных беларусаў. А ваколіцы гэтыя — гэта чысьцюсенька беларускія вёскі, паміж раскінуўшыміся шырокімі абшарамі двароў, на абшарах каторых завялося цяпер і польскіх вайсковых асаднікаў. Характар гэтых ваколіц чыста беларускі. Ды і нічога дзіўнага, бо насельніцтва тут у вялізарнай большасьці беларускае. Па рэлігіі — праваслаўныя, ёсьць і каталікі. У цэрквах праваслаўных да народу прапаведнікі гавораць парасейску, а ў касьцёлах каталіцкіх — папольску. Але вось некалькі гадоў таму каля Слоніма, ў Альбэртыне, аселі езуіты ўсходняга абраду. Сьвяшчэннікі гэтыя, так як і праваслаўныя, ня голяць бароды і вусоў, моляцца таксама паправаслаўнаму, але пропаведзі да беларускага народу гавораць пабеларуску. Гэта уніяты.

Вось нядаўна, бо 25 мінулага м-ца ў Жыравіцах адбываўся каталіцкі фэст Найсьвяцейшай Дзевы Марыі. З ваколічных каталіцкіх парафіяў ксяндзы з народам прыбылі на гэты фэст. Прыбыў туды і альбэртынскі праваслаўны езуіт а. Неманцэвіч, здацца беларус. Народу ў Жыравіцы набралася поўна, пераважна каталікі, але было і праваслаўных, хто з цікавасьці, а хто проста на фэставы кірмаш. Пачалося набажэнства. Езуіт Неманцэвіч адправіў службу Божую паправаслаўнаму і сказаў пропаведзь, але як? — **пабеларуску!** Людзі проста ахнулі, а слухалі дык і апісаць трудна. Словы сказаныя езуітам у гэтай пропаведзі людзі разьнеслі па ўсей Слонімшчыне. Папробуй запытаць першага спатканага ў Слонімшчыне беларуса, праваслаўнага ці каталіка, што казаў у пропаведзі беларускай езуіт у Жыровіцах, то напэўна пачуеш, што Найсьвяцейшая Дзева Марыя ў Чанстахове для Палякоў, а ў Жыравіцах для Беларусаў і яна роўная Маці, як для Палякоў, таксама для Беларусаў і Літоўцаў.

З гэтага ясна, што трэба заводзіць пропаведзі пабеларуску ва ўсіх праваслаўных цэрквах на Беларусі, бо народ любіць сваю мову і сказаныя ў роднай мове духаўнікам словы прыймае глыбака да сэрца.

Мак—чык.

ПРЫЧЫНЫ ПАШЫРЭНЬНЯ СЭКТАНСТВА.

Асінагародцы, Пастаўскага пав. У апошнія часы сярод нашага беларускага народу вельмі пачало шырыцца сэктанства, а іменна баптызм. На мой пагляд вінаўныя ў гэтым найбольш нашы духоўныя пастыры, якія так ганебна адагналі ад Царквы Хрыстовай паверанную ім Госпадам паству. Дзеля прыкладу прывяду факт.

Наш прыход гады два таму перажываў духоўную трагэдыю. Духаўнік у нас быў такі, што зжаліся Божа, што ён вырабляў. Задраўся ён з дзякам, пасыпаліся жальбы ад дзяка на настаяцеля, а ад настаяцеля на дзяка да архірэя ў Вільню. Паплылі прашэньне за прашэньнем да архірэя ад прыхаджан з просьбамі забраць ад нас сьвяшчэнніка і прыслаць нам другога адпаведнага чалавека. Архірэй Хвядос сьпярша пераныў настаяцелю, забараніў дзякану правіць Службу Божую і забраў яго ад нас, бо ўважаў, што ўся несуненіца паходзіць ад дзякана. Прыхаджане, бачачы, што няма рады, пачалі змагацца з сьвяшчэннікам іншым спосабам. Замкнулі царкву ад сьвяшчэнніка і толькі гэткім спосабам удалося ім разьвязацца з непажаданым сьвяшчэннікам.

Вось гэтае перажываньне моцна падарвала аўторытэт духоўнай ўлады і духавенства ў народзе. Сэктанства з гэтага толькі скарыстала. Зараз жа пачалі хадзіць па вёсках прапаведнікі сэкты ды паказваць пальцамі на паступкі нашага духавенства, а запярэчыць ім дык і ня было чым. Інтэлігентнейшых, але так-жа слабых у веры Хрыстовай падкупілі, а просты народ падгаварылі і гэтак „налавілі рыбы ў змучанай вадзе.“

Вельмі дзіўна, што ані разу не прыехаў да нас Архірэй, каб пагледзець што ў нас тады рабілася. Гэта-ж яго сьвяты абавязак, як нышэйшага архіпастыра. Ды ня толькі тады, але і ніколі не прыяжджаў ён падзяліцца з духоўнымі дзяцьмі радасьцяй духовай і горам. Прыхаджане толькі чуюць ў малітвах царкоўных аб архірэю, але бачыць яго яшчэ ня бачылі.

Аднак вера ў нашых людзей яшчэ ня выгасла і народ спадзяецца, што прыйдзе пара і ў кожным праваслаўным прыходзе на Беларусі будуць пастыры такія, які цяпер прыехаў у суседні прыход — у Норыцу, айцец Александар Кушч. Дай-жа Божа.

Стары Беларус.

Земляробскія навіны.

Сёлетні ўраджай ва ўсім сьвеце. Міжнародны Земляробскі Інстытут у Рыме (Італія) аблічыў, што сёлетні ўраджай збожжа ва ўсім сьвеце агулам дасьць на 60 мільёнаў пуд ў менш чымсь у мінулым годзе. Гэнае абліччэньне абымае ўсе краі апрача Расеі і Кітаю.

Нязважаючы на гэта на сусьветных рынках не спадзяюцца вялікай падвышкі цэнаў на збожжа, бо сёлета ўва многіх краёх добры ўраджай на бульбу і добра ўрадзіла кукуруза. Апрача гэтага, краі, у якіх найбольш ёсьць збожжа на прадаж (Паўночная Амэрыка, Канада, Аргентына, Аўстрыя) маюць многа збожжа леташняга.

Таксама прычына крызысу ў земляробстве. Земляробы заўважваюць, што прычынай крызысу зьяўляецца так-жа і тое зьявішча, што цяпер (пасьля сусьветнай вайны) людзі менш зьядаюць земляплодаў, чымсь прад вайной. І праўды. Статыстыка міжнароднай консумцыі (спажывецтва) ўстанавіла, што ў 1913 14 гаспадарчым годзе на аднаго чалавека на ўсім сьвеце прыпадала 153,1 кілёгр. жыта, а ў 1929 30 г. ўжо толькі 109 5 кілёгр. Абнізілася таксама і консумція пшаніцы: з 96 кілёгр. у 1913-1914 г. — да 69.8 кілёгр. у 1929 30 г.

Таксама панізілася спажываньне бульбы: прад вайной спатрабавалася яе 700,7 кілёгр. на асобу, а цяпер ледзь 531 кілёгр., значыць кругла каля 170 кілёгр. менш.

Зьмяншэньне консумцыі гэтых земляробскіх прадуктаў пакрываецца цяпер падвышкай консумціі цукру і мяса. Прад вайной цукру спажывалі ў сярэднім па 17 кілёгр. на асобу ў год, а цяпер спажываюць па 23,3 кілёгр. на асобу. Мяса прад вайной спажывалі на асобу 49.3, а цяпер па 50,5 кіл. у год.

Змаганьне культурных сялян з бязцэннасьцяй збожжа. У Францыі пашырылася цяпер арганізаваная акцыя сялян з бязцэннасьцяй збожжа. Там гандаль збожжам знаходзіцца ў руках самых жа сялян — земляробскіх коопэратываў. Вось-жа ўсе гэтыя коопэратывы пастанавілі не прадаваць гуртоўнікам аніводнага пуда пшаніцы, пакуль ня будуць плаціць за пуд пшаніцы (на польскія грошы) 6—7 зл.

Дзеля таго, што гэтая акцыя абхапіла ўсе земляробскія коопэратывы і праводзіцца даволі энэргічна, ёсьць надзея, што францускія сяляне саргавізаваныя ў сваю земляробскую коопэрацыю, свайго дасягнуць.

У нас гэта зрабіць трудна дагуль, пакуль нашае сялянства ня мае сваей моцнай коопэрацыі.

Цэны збожжа ў Варшаве. У канцы мінулага м-ца на варшаўскім рынку цана збожжа (вагонам) была такая: пуд жыта 2 зл. 70 гр., пуд аўса 2 зл. 75 гр., ячменю 2 зл. 60 гр.

лы лёгка даруская такія немузыкальнасьці*) і такіх прыкладаў у яго можна знайсьці многа.

V.

Я. Купала — оптыміст. Прычыны заняпаду яго творства ў Радавай Беларусі.

Урэшце трэба адзначыць дужа цікавую і нават дзіўную асаблівасьць. Большая часьць нязусім дабрагучных вершаў прыпадае ў Купалы **на тыя яго творы, у якіх ён выражае сум, гнеў, нездаваленьне, тугу, крыўду.** А як толькі выходзе **на сонца**, на сьвет, паглядзіць на неба, на зоркі, дык адразу верш яго робіцца гладкім, прыгожым, яркім, дабрагучным. Гэта асабліва кідаецца ў вочы тады, калі ў адным і тым самым вершы Купала гаворыць і аб чым-небудзь ясным, сьветлым, вясёлым і аб цяжкім і сумным. Прывяду для прыкладу хоць адзін верш: „Як я полем іду“ („Шлях. жыцьця, 22). Пакуль паэт „ідзе“ полем, лугам і лесам, пакуль перад ім прыгожасьць Божага сьвету, вершы яго коцяцца лёгка, як тая рэчка па лузе, а як увайшоў у хату, пабачыў нуду і гора, адразу (быццам калясо за пень зачапіўся!) верш робіцца цяжкім і недабрагучным:

„Бледны сум падыходзіць, прыносіць нуду,
Ў заплясьнелым куту цені касьцістыя
[пьвіце.“

Ажно цяжка выгаварыць. І гэтакіх прыкладаў можна даць нямала.

Гэта ўсё паказвае, што па сутнасьці свайей паэтычнай стыхіі Я. Купала ёсьць блізу моўна паэтам — **оптымістам.** Душа ў яго сьветлая, сонечная, зорная і сама дзеля таго імкнецца „да сонца“ і „да зор.“ Нават гэта выяўляецца ў некаторых „богаборчых“ вершах Янкі, напісаных у астатнія гады ў „Савецкай Беларусі.“ „Бунт проці Бога“ сусім не ўдаецца Я. Купале, яго процібожныя вершы скарэй напамінаюць нам нейкія капрызныя дзяціныя жальбы: Я. Купала ніяк ня можа зразумець, як гэта Бог не пасылае яму „такому добраму Яначцы“ і яго бязьмерна любай бацькаўшчыне патрэбнага дабра, цяпла і сьвету!

Гэта сонечная стыхія Я. Купалы асабліва ясна выяўляецца ад бліжэйшага параўнаньня Яго з украінскім паэтам Т. Шэўчэнкам. Ня можна нават і прадставіць сабе, што рабіў-бы Шэўчэнка, аб чым-бы ён пяяў, калі б на сьвеце ня было суму і гора. Чым больш цяжка на сэрцы, тым плаўней, тым прыгажэй коцяцца яго вершы („Думы мої, думы, лыхо мэні з вамі...“). Ён дужа падобны да тых кветак, якія разварачываюць пялюсткі толькі воччу, толькі ўночы яны і цьвітуць і пахнуць. Наадварот — Я. Купала напамінае сабой тыя кветкі, якія ўсёй сваёй стыхіяй імкнуцца да сонца. Яны паварачываюць свае галоўкі разам з сонцам, прагавіта глядзяць на яго і жадліва глытаюць сонечныя праменьні, бо тады, толькі тады яны могуць і цьвісьці, і пахнуць, і прынасіць плады. Не дарма, як адзначылі самі савецкія крытыкі, так панізілася „там“ яго творчасьць. Бяз сонца, той, хто ірвецца „к сонцу душой“, тварыць ня можа, а ў абставінах жыцьця Савецкай Беларусі так мала сьвету, цяпла і сонца! І ў сучаснай яго творчасьці, у кожным яго цяперашнім вершы, адчуваецца, як сказана вышэй, нейкая глыбокая трагэдыя, а ён паводле таленту ня трагік.

Нам здаецца дзеля гэтага, што поўны расьцьвет творчасьці Я. Купалы яшчэ не наступіў. Ён наступіў-бы тады, калі наступіў-бы расьцьвет Беларусі. Гэтыя кветкі цьвітуць толькі пад сонцам.

Закончу славамі самога Купалы з яго вершу „Бацькаўшчыне“:

„Людзі мруць, а ўсё ждуць багатай уроды,
Мо' і к нам прыбягуць шчасьлівыя годы.
О, тады... сноп у сноп жніво наша будзе...
Сотня коп, мільён коп... Дзівуйцеся, людзі!
А цяпер... што цяпер?
— Бывайце здаровы!“

*) У гэтым сэнсе Я. Купала дужа напамінае расейскага паэта Дзержавіна, у якога нярэдка можна спаткаць такія вершы: „Чаша, где скрыт яд.“ Пушкін не цярпеў такіх вершаў і ўважаў што у Дзержавіна „грубое вуха.“

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.